# www.Corpus.by

Платформа Corpus.by — гэта камп’ютарна-лінгвістычны фрэймворк, які ўтрымлівае больш за 30 сэрвісаў для апрацоўкі электронных тэкстаў і гукавых дадзеных.




### Сінтэзатар маўлення па тэксце

Агучвае тэкст, уведзены карыстальнікам, і фарміруе гукавы файл, які можна спампаваць і захаваць на камп’ютары.




### Праверка правапісу

Правярае правільнасць напісання слоў. Карыстальнік атрымлівае дадзеныя пра колькасць знойдзеных ва ўваходным тэксце ўнікальных слоў і слоў, якія, верагодна, утрымліваюць памылкі.

# Накірункі працы

- Сінтэз і распазнаванне маўлення
- Апрацоўка натуральнай мовы і электроннага тэксту
- Камп’ютарная лінгвістыка
- Камп’ютарнае кланаванне голасу
- Сістэмы рэабілітацыі інвалідаў слыху і зроку

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

# Кантакты


**Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення**

вул. Сурганава, 6
Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, 220012

8 (017) 284-27-73
8 (017) 331-84-03 (факс)

www.ssrlab.by
www.corpus.by

ssrlab221@gmail.com




# Лабараторыя распазнавання і сінтэзу маўлення

Аб’яднаны інстытут праблем інфарматыкі

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

# Multiphone

Даследчая праграма сінтэзу маўлення па тэксце на беларускай і рускай мовах з шырокімі эксперыментальнымі магчымасцямі змены голасу, інтанацыі і шматлікіх іншых параметраў сінтэзаванага маўлення.

## Дадатковыя функцыі

- Змена голасу
- “Гаворачая галава”
- Інтанацыі



## Дзе прымяніць?

- Гаворачы камтутар для тых, хто слаба бачыць
- Сістэмы галасавых абвестак
- Сістэмы навучання
- Інфакіёскі
- Агучка кніг

# KrokApp

Мабільная праграма KrokApp — гэта персанальны аўдыёгід па гарадах Беларусі.




З KrokApp жыхары і госці беларускіх гарадоў змогуць праслухаць цікавыя факты пра славутыя месцы, пашырыць веды пра гісторыю краіны.




У KrokApp распрацоўваюцца функцыі для замежных гасцей: яны змогуць не толькі паслухаць экскурсію, але і навучыцца формам ветлівасці на беларускай мове, назвам гарадоў, мясцінаў, страў, даведацца пра іншыя беларускія адметнасці.

# Voice Informator



Праграмна-апаратны комплекс VoiceInformator прызначаны для перадачы галасавых або SMS-паведамленняў па лініях GSM-сувязі вялікай колькасці абанентаў па зададзеным спісе і сцэнарыі, а таксама выканання функцыі аўта-адказчыка.

Падтрымліваецца праца з некалькімі мадэмамі адначасова.



## Асноўныя рэжымы працы

- Рэжым аўтапразвонкі
- Рэжым аўтаадказчыка
- Рэжым аўтапразвонкі запісу GSM-лініі